*Чытаем разам*

# “Небясплатная бібліятэчка”



**Вось ужо некалькі гадоў існуе паслуга “небясплатная бібліятэчка”. За гэты час яна стала звыклай і зручнай для чытачоў. А пачалося ўсё са стварэння першых камерцыйных фондаў, для чаго і былі закуплены першапачатковыя партыі кніг. Людзі зацікавіліся, бо ім прапануюць цікавыя новыя выданні. Многім з нас на закуп усіх навінак ва ўласныя бібліятэкі падчас не хапае ні грошай, ні месца на кніжных паліцах, а тут прыйшоў, узяў на пэўны час (дзень-два) і вярнуў назад.**

У Ждановіцкай сельскай бібліятэцы платныя паслугі прапануюць крыху больш чым за год. Загадчыца гэтай установы Галіна Атрасевіч адзначыла паспяховасць навінкі. За апошні час павялічылася і агульная колькасць чытачоў, многія з якіх рэгулярна звяртаюцца менавіта да платных паслуг. Сярод пастаянных наведвальнікаў ёсць і моладзь, і людзі сярэдняга ўзросту, і пенсіянеры.

Прываблівае чытачоў невысокі кошт паслугі — усяго пяцьсот рублёў за тры дні, што значна ніжэй цаны на кнігу, якая пасля прачытання будзе хутчэй за ўсё незапатрабавана пыліцца на кніжнай паліцы.

Дарэчы, папаўненню камерцыйнага фонду спрыяюць і самі чытачы, многія з якіх падаравалі шмат сваіх кніг у “небясплатную бібліятэчку”.

Сельскія чытачы цікавяцца кнігамі самых розных жанраў: дэтэктывамі, гістарычнымі і жаночымі раманамі, класікай, фантастыкай. На паліцах бібліятэкі — новыя выданні па эканоміцы, юрыспрудэнцыі, паліталогіі, філасофіі і іншых дысцыплінах.

Бібліятэкар Валянціна Слесарава адзначыла, што сярод наведвальнікаў шмат студэнтаў, якія вельмі ахвотна карыстаюцца платнымі паслугамі, што дапамагае эканоміць немалыя грошы. Напрыклад, навучальную літаратуру, патрэбную толькі на час сесіі, можна ўзяць за сімвалічную аплату.

На жаль, на набыццё дарагіх выданняў за дзяржаўны кошт выдзяляецца недастаткова сродкаў, а платныя паслугі дазваляюць зрабіць дадатковы закуп неабходнай літаратуры. Так, у Ждановіцкай сельскай бібліятэцы да канца бягучага года дзякуючы “небясплатнай бібліятэчцы” плануецца атрымаць чатырыста тысяч рублёў, за якія можна будзе абнавіць камерцыйны фонд.

Плённа працуюць бібліятэкары і над папулярызацыяй беларускіх аўтараў. Арганізоўваюцца прэзентацыі кніг і сустрэчы чытачоў з пісьменнікамі. Тут адкрываюць новыя імёны: Наталля Батракова, Сяргей Клімковіч, Тамара Лісіцкая.

Мабыць, цяпер многія з вас, паважаныя чытачы, перш чым завітаць у кніжную краму, пашукаюць на паліцах “небясплатнай бібліятэчкі” тую самую кнігу, якую хацелі б прачытаць. Калі ж вы пакінеце заяўку, то да карыснай паслугі звернецеся яшчэ не адзін раз. Прыемнага чытання!

**Кацярына ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ.**

**НА ЗДЫМКУ:** чытаць будзем разам.

Фота аўтара.

**Мінская праўда. – 2006. – 26 ліпеня.**